праекты

# Запрашае «Беларускі салавей»

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі працягвае работу над маштабным віртуальным праектам «На хвалі часу, у плыні жыцця», прымеркаваным да 100-годдзя літаратурнага аб'яднання «Маладняк». У межах праекта на працягу трох гадоў ладзяцца розныя мерапрыемствы і ініцыятывы да юбілейных дат пісьменнікаў-маладнякоўцаў.**

Летась папулярнасць набыў Рэспубліканскі анлайн-конкурс чытальнікаў «О, Беларусь, мая шыпшына», арганізаваны да 120-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Дубоўкі. Восенню бібліятэка запрашае ўсіх жадаючых узяць удзел у другім, не менш цікавым літаратурным конкурсе «Беларускі салавей», які ладзіцца да 135-годдзя Змітрака Бядулі. Інфармацыйную падтрымку забяспечваюць, газеты «Літаратура і мастацтва» і «Настаўніцкая газета», часопіс «Бярозка».

Літаратурны конкурс пройдзе з 1 да 31 кастрычніка. Удзельнікамі могуць стаць усе зацікаўленыя незалежна ад узросту. Трэба даслаць на электронную пошту *konkurs.nlb@gmail.com* невялікае эсэ (1—3 друкаваныя старонкі фармату А4) з сюжэтнай лініяй *prequel*, *sequel* або *spin-off* па наступных творах Змітрака Бядулі (на выбар): «Салавей», «Сярэбраная табакерка», «Бондар», «На Каляды к сыну». Удзельнік мае права прадставіць і некалькі работ пры ўмове выкарыстання сюжэтных ліній з розных вышэйпералічаных твораў пісьменніка.

Экспертнае журы конкурсу, у склад якога ўваходзяць літаратуразнаўцы, пісьменнікі і журналісты, будзе ўлічваць зыходны літаратурны матэрыял, але ад аўтараў эсэ чакаюцца арыгінальныя ідэі, стылістычная выбудаванасць і лагічнасць выкладу. Будуць ацэньвацца раскрыццё праблемы, яркасць сюжэтнай лініі ды багацце беларускай літаратурнай мовы.

Пераможцы атрымаюць памятныя дыпломы і падарункі ад партнёраў конкурсу, сярод якіх — Выдавецкі дом «Звязда», Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача, Вялікі тэатр Беларусі. Лаўрэатаў запросяць на выніковае мерапрыемства з экскурсіяй па Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, наведваннем музея кнігі і пад'ёмам на аглядную пляцоўку. Найлепшыя творы будуць апублікаваны ў газеце «Літаратура і мастацтва», часопісе «Бярозка», у сацыяльных сетках Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, суполцы ў *Facebook* «Маладняк — першае літаратурнае аб'яднанне Беларусі», на сайтах і ў сацыяльных сетках інфармацыйных партнёраў конкурсу.

Больш падрабязна пра літаратурны конкурс «Беларускі салавей» можна даведацца на інтэрнэт-партале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі *www.nlb.by,* на старонцы праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця», а таксама па тэлефонах: (8 017) 293 27 19, 293 29 69, 293 27 43.

**Юлія АМОСАВА**